СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*III квартал*	*паўгоддзе*
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 МАЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 101
(26709)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АГЕНЦТВА ІНВЕСТЫЦЫЙ І ПРЫВАТЫЗАЦЫІ СТВАРАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ

Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальнае агенцтва інвестыцый і прыватызацыі» ствараецца ў Беларусі. Указ аб гэтым № 273 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 25 мая.

Такім чынам, у краіне фарміруецца спецыялізаваная арганізацыя па комплексным суправаджэнні інвестараў (перш за ўсё замежных).

Агенцтва ствараецца на аснове існуючага РУП «Нацыянальнае інвестыцыйнае агенцтва», якое знаходзіцца ў падпарадкаванні Міністэрства эканомікі, шляхам яго пераўтварэння.

Асноўным прадметам дзейнасці агенцтва з'яўляецца забеспячэнне прыцягнення інвестыцый у Беларусь, у тым ліку пры прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

Агенцтва падпарадкоўваецца ўраду і падкантрольна наглядальнаму савету, які ажыццяўляе каардынацыю работы і кантроль за яго дзейнасцю, і прадстаўляе інтарэсы дзяржавы па пытаннях прыцягнення інвестыцый у Беларусь, у тым ліку пры прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

Новы статус дасць магчымасць агенцтву весці паўнацэнную работу з органамі дзяржаўнага кіравання, забяспечваць якаснае і аператыўнае ўзаемадзеянне інвестараў і рэгіянальных органаў кіравання, стаць «адным акном» для інвестараў незалежна ад спосабу іх прыходу ў Беларусь, а таксама павысіць эфектыўнасць правядзення прыватызацыйных працэсаў у краіне і прыцягнення інвестыцый у эканоміку Беларусі.

ПРЫБЫТАК НАЦБАНКА БЕЛАРУСІ Ў 2009 ГОДЗЕ СКЛАЎ BR15,5 МЛРД

Аляксандр Лукашэнка 25 мая ўказам № 274 зацвердзіў справаздачу Нацыянальнага банка за 2009 год.

У мінулым годзе грашова-крэдытная палітыка праводзілася ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2009 год, адзначылі ў прэс-службе. Выкананне асноўных напрамкаў забяспечана, таму што скаардынаваныя дзеянні ўрада і Нацыянальнага банка далі магчымасць пазбегнуць рэцэсіі, забяспечыць стабільны кошт кошыка замежных валют, устойлівасць банкаўскага сектара, эфектыўнае і бяспечнае функцыянаванне плацежнай сістэмы.

Гадавая справаздача змяшчае інфармацыю аб дзейнасці Нацыянальнага банка і яго фінансавую справаздачнасць (з улікам аўдытарскага заключэння). Фінансавая справаздачнасць адлюстроўвае аперацыі Нацыянальнага банка, праведзеныя ім у 2009 годзе, і ўключае гадавы бухгалтарскі баланс, справаздачы аб прыбытку і стратах, аб змяненні капіталу, аб фарміраванні і выкарыстанні фондаў, аб кіраванні долямі (акцыямі) у статутных фондах іншых арганізацый, аб расходах на ўтрыманне Нацыянальнага банка, аб выкананні каштарыса капітальных укладанняў, аб атрыманым прыбытку і яго размеркаванні.

Дакладнасць гадавога бухгалтарскага балансу Нацыянальнага банка за 2009 год, справаздачы аб прыбытку і стратах за 2009 год пацверджана міжнароднай аўдытарскай кампаніяй — замежным прыватным унітарным аўдытарскім прадпрыемствам «Дэлойт і Туш».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» сообщает, что с 27 мая 2010 года устанавливается следующий размер процентов по вновь привлекаемым депозитам физических лиц в белорусских рублях:

Наименование	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)
Праздничный	65 дней	19
Перспективный	18 месяцев	СР+8,5 (20,5 %)

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

В соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь № 22 от 04.11.2008, государство гарантирует полную сохранность денежных средств физических лиц в белорусских рублях и иностранной валюте, размещенных на счетах и (или) во вклады (депозиты) и возмещение 100 процентов суммы этих средств в валюте счета либо вклада (депозита).

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- **148** (в стационарной сети);
- МТС (029) **5 148 148, 2 148 148;**
- Velcom (044) **77 00 148, 77 55 148.**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2009 г. (млрд. руб.): январь – 4,6; февраль – 4,0; март – 4,8; апрель – 4,8; май – 4,7; июнь – 5,0; июль – 4,9; август – 4,9; сентябрь – 4,9; октябрь – 5,1; ноябрь – 5,6; декабрь – 5,8.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

ЗА СТО ГАДЗІН ДА ЛЕТА...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спецыялісты зелянбуда Кастрычніцкага раёна ствараюць кветкавую кампазіцыю з гадзіннікам на прывакзальнай тэрыторыі сталіцы.

Парламенцкі дзённік

СЛЕДСТВА ВЯДУЦЬ... СА ЗЛАЧЫНЦАМ

Наватарскія папраўкі ў крымінальнае заканадаўства абяцаюць «пернік» для завадатараў арганізаваных груп — змякчэнне пакарання за дапамогу ў раскрыцці злачынства.

Крымінальнае заканадаўства Беларусі, здаецца, стала на шлях лібералізацыі. Прынамсі папраўкі, што змяняюць націск і кропку прыкладання сілы караючай рукі, падтрыманыя дэпутатамі ў першым чытанні. Арыенцір, як вынікае са слоў **Генеральнага пракурора краіны Рыгора ВАСІЛЕВІЧА,** — на дэмакратызацыю і садзейнічанне больш поўнаму пакрыццю шкоды ад учыненага злачынства. Так, напрыклад, кіраўнікоў арганізаваных злачынных груп будуць стымуляваць супрацоўнічаць са следствам. Якім чынам? Суду дазволяць змякчаць для іх пакаранне пры пэўных абставінах — да ніжняй мяжы, прадугледжанай канкрэтным артыкулам. Навошта гэта праваахоўнікам? Рэч у тым, што арганізаваныя групы, як правіла, парушаюць закон з размахам — маштабы ўрону велізарныя, а «выявіць і канфіскаваць злачынныя даходы без садзейнічання кіраўніка групы вельмі складана, бо імі распараджаецца менавіта ён», — перакананы Р. Васілевіч.

Да наватарскага заходу дэпутаты паставіліся асцярожна. Генпракурор акцэнтаваў, што ў кожнай канкрэтнай сітуацыі ўсё ўзважыць суд, будзе магчымасць улічыць і ступень віны, і акалічнасці, якія яе змякчаюць, — наколькі эфектыўнай была дапамога следству, наколькі вялікае раскаянне.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ РАСКРЫЛА ЗВЕСТКІ ПРА СВОЙ ЯДЗЕРНЫ АРСЕНАЛ

Урад Вялікабрытаніі раскрыў звесткі пра ядзерны арсенал краіны. Паводле заявы ўладаў, колькасць актыўных, гэта значыць тых, якія знаходзяцца на пастаянным дзяжурстве, боегаловак складае 160 адзінак. Вялікабрытанія не мае намеру нарошчваць колькасць ядзерных боегаловак звыш 225 адзінак.

Па словах міністра замежных спраў Вялікабрытаніі Уільяма Хейга, раскрыццё гэтай інфармацыі дазволіць павысіць узровень даверу паміж ядзернымі і няядзернымі краінамі.

Раней звесткі пра ядзерны арсенал апублікавала Міністэрства абароны ЗША, згодна з якімі, ЗША маюць 5113 ядзерных боезарадаў.

ПОЛЬСКІ ЭКСПЕРТ ПРЫЗНАЎ ВІНУ ЭКІПАЖА Ў КАТАСТРОФЕ САМАЛЁТА КАЧЫНЬСКАГА

Кіраўнік дзяржаўнай камісіі Польшчы па расследаванні авіяцыйных здарэнняў Эдмунд Кліх прызнаў віну экіпажа ў катастрофе самалёта польскага прэзідэнта Леха Качыньскага. Па словах Кліха, які з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком Польшчы ў тэхнічнай камісіі па расследаванні аварыі пад Смаленскам, пілоты праігнаравалі ўсе папярэджанні аб небяспецы і пайшлі на празмерную рызыку.

Эдмунд Кліх адзначыў, што да такой высновы ён прыйшоў, азнаёміўшыся са звесткамі «чорных скрыняў», а таксама са стэнаграмамі гутарак у кабіне. Па яго меркаванні, пілоты пайшлі на рызыку таму, што іх так вучылі. Кліх таксама адзначыў, што сам рызыкуе, ускладаючы ўсю адказнасць на пілотаў. У той жа час ён падкрэсліў, што грамадскасць павінна ведаць пра гэта.

Польскія палітыкі, у сваю чаргу, не пагадзіліся з заявамі Кліха. Міністр унутраных спраў Польшчы Ежы Мілер адзначыў, што эксперт усяго толькі спрабуе прыцягнуць да сябе ўвагу сродкаў масавай інфармацыі. Прадстаўнікі партыі «Права і справядлівасць» дадалі, што расследаванне прычын катастрофы працягваецца і афіцыйныя вынікі яшчэ не апублікаваныя.

ДЗЕЯННІ БАБРОЎ СТАЛІ АДНОЙ З ПРЫЧЫН ПАВОДКІ Ў ПОЛЬШЧЫ

Бабры наскрозь пракапалі жыццёва важныя дамбы, што баранілі гарады Польшчы ад разліваў Віслы і сталі міжвольнымі вінаватымі разбуральных паводак у краіне, якія панеслі жыцці ўжо 15 чалавек.

«Лютым ворагам збудаванняў, якія абараняюць нас ад паводак, стала жывёла, названая бабром. Яны жывуць паўсюль уздоўж дамбаў на Вісле і з'яўляюцца прычынай вялікіх разбурэнняў на іх», — заявіў міністр унутраных спраў Польшчы Ежы Мілер. Па звестках эколагаў, Польшчу засяляюць каля 50 тыс. гэтых грызуноў. Бабры знаходзяцца пад абаронай польскай дзяржавы, аднак мясцовыя ўлады з-за паводкі павялічылі паляўнічыя квоты на іх.

МАРАДОНА ПААБЯЦАЎ АДЗНАЧЫЦЬ ПЕРАМОГУ НА ЧМ-2010 ПРАБЕЖКАЙ У ГОЛЫМ ВЫГЛЯДЗЕ

Галоўны трэнер зборнай Аргенціны па футболе Дыега Марадона заявіў, што ў выпадку перамогі яго каманды на чэмпіянаце свету ён прабяжыць па галоўным пляцы Буэнас-Айрэса ў голым выглядзе. Марадона паабяцаў прабегчы вакол Абеліска Буэнас-Айрэса — галоўнага помніка сталіцы Аргенціны. Марадона зрабіў сваю заяву ў прамым эфіры аргенцінскай радыёстанцыі FM Metro.

СУПРАЦОЎНІЦА БАНКА ПАДАЗРАЕЦЦА Ў КРАДЗЯЖЫ ГРОШАЙ

Мсціслаўскі РАУС распачаў крымінальную справу супраць работніцы банка, якая падазраецца ў тым, што з леташняга лістапада па сёлетні май скрала каля 11 мільёнаў рублёў з банкаўскага рахунка, які належаў 23-гадоваму прадпрымальніку.

Алена КАЗЛОВА.

Уважаемые акционеры

ОАО «ПИЩЕВОЙ КОМБИНАТ «ВЕСЕЛОВО»

10 июня 2010 года состоится внеочередное собрание акционеров.

Место проведения собрания: ул. Заводская, 24, 222132, д. Веселово, Борисовский район, Минская область, актовый зал ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».

Повестка дня:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».
2. Об утверждении решения о выпуске акций дополнительной эмиссии.
3. О внесении изменений в Устав ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».

Начало регистрации с 13.00 до 14.40.
Начало собрания: 15.00.
Для регистрации при себе иметь акционеру Общества паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 690277551

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У БЕЛАРУСІ ДОБРЫЯ ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Паводле меркавання экспертаў Міжнароднага валютнага фонду, у Беларусі захаваныя ўмовы для хуткага вяртання да высокіх устойлівых тэмпаў эканамічнага росту.

Пра гэта, як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва Упраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Беларусі, было заяўлена па выніках працы місіі МВФ па падвядзенні вынікаў рэалізацыі праграмы стэнд-бай. Эксперты фонду пазітыўна ацанілі выкананне нашай краінай асноўных параметраў і ўмоў праграмы і адзначылі яе станоўчы ўплыў на зніжэнне ўздзеяння негатыўных знешніх фактараў на Беларусь. У Нацбанку адзначаюць, што падчас працы місіі эксперты МВФ абмеркавалі з беларускімі ўладамі перспектыўныя напрамкі далейшага супрацоўніцтва, а таксама канкрэтныя галіны аказання тэхнічнай падтрымкі з боку Міжнароднага валютнага фонду па актуальных напрамках эканамічнай палітыкі краіны.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫПАЎ З МАШЫНЫ

Каля 18.30 22-гадовы кіроўца нападпітку і без правоў ехаў на лесавалачнай машыне «Valmet».

Падчас руху па аўтадарозе Яршы—Явішчы—Касцяшы, на тэрыторыі Уздзенскага раёна, з кабіны гэтай машыны праз бакавое шкло, якое адсутнічала, выпаў 31-гадовы пасажыр. Трапіў пад задняе правае кола і загінуў на месцы здарэння.

У той жа дзень ад атрыманых траўмаў у бальніцы загінуў 22-гадовы пасажыр аўтамабіля «Лянча». ДТЗ, якое пазбавіла яго жыцця, адбылося на Партызанскім праспекце Мінска. За рулём іншаматкі знаходзіўся 18-гадовы «бяспраўны» навучэнец ПТВ, ён выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе сутыкнуўся з аўтамабілямі ВАЗ і «Опель-Вектра».

Надзея ДРЫЛА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОМО – ММЗ ИМЕНИ С.И. ВАВИЛОВА» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складского комплекса, расположенного по адресу: Минский район, Колодищанский с/с, Промузел «Колодищи» в составе:

1) Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5 кв.м; **16)** Здание блока складских помещений, 844,7 кв.м; **17)** Здания складов, 141,0 кв.м; 184,9 кв.м; 240,5 кв.м; 258,4 кв.м; **18)** Пристройка к сборно-щитовому домику, 70,5 кв.м; а также сооружений и оборудования. Начальная цена с НДС – 6 582 216 240 бел.руб. Площадь земельного участка – 7,9748 га. Задаток – 500 000 000 бел. руб. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества, подлежащего продаже, оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009. Аукцион состоится **04.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 03.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛТОРГСТРОЙ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости в составе: **Лот № 1:** здание растворобетонного узла, об. пл. 359 кв.м; здание наклонной галереи об. пл. 156 кв.м; здание компрессорной, об. пл. 48 кв.м, расположенные на земельном участке пл. 0,6144 га; трансформаторная подстанция, об. пл. 38,2 кв.м, расположенная на земельном участке пл. 0,0246 га. Объекты расположены по адресу: **г. Гомель, пер. Строителей, 3.** Начальная цена с НДС – 558 521 877 бел. руб. **Лот № 2:** здание проходной и ЦТП, об. пл. 99,0 кв.м, расположенное по адресу: **г. Могилев, Славгородское шоссе, 150.** Начальная цена с НДС – 47 001 960 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,2061 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней со дня проведения аукциона, *если иное не предусмотрено договором купли-продажи.* Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **29.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 28.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

«Еўрабачанне-2010»

БЕЛАРУСЬ ПРАЙШЛА Ў ФІНАЛ КОНКУРСУ.

ЦЯПЕР ХОЧАЦЦА БОЛЬШАГА!

...Вось і не вер пасля гэтага букмекерам — іхнія стаўкі на выхад беларускага гурта «3+2» у фінал 55-га міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачанне» цалкам апраўдаліся. Затое як, напэўна, расчаравалася тыя, хто прадракаў правал прадстаўніку Расіі Пятру Налічу — ягоны іранічна-рамантычны «плач пакінутай славянкі» прагучаў проста бездакорна і таксама заслужана апынуўся ў фінале! Таксама, мяркуючы па папярэднім галасаванні журналістаў у Осла, яшчэ пазаўчора мала хто верыў у Партугалію і Боснію — ім прагназавалі нявыхад з паўфіналу...

Зрэшты, збольшага вынікі першага паўфіналу — па агульных ацэнках, слабейшага за другі — былі добра бачныя ўжо ў час выступлення апошняга з 17 удзельнікаў. Асабіста я (напрыклад) без напружання адгадала 8 з 10 фіналістаў. Цалкам дзясятка шчасліўцаў, якія атрымалі зялёнае святло ад гледачоў і суддзяў, выглядае так (у парадку абвяшчэння): Боснія і Герцагавіна, Малдова, Расія, Грэцыя, Партугалія, Беларусь, Сербія, Бельгія, Албанія і Ісландыя. Але парадак гэты адвольны і не сведчыць пра колькасць набраных кожнай краінай балаў — зводныя шыльды абодвух паўфіналаў з ацэнкамі будуць абнародаваныя толькі пасля фіналу шоу.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА

Ну і ну!

ЕХАЛІ Ў РАСІЮ, ТРАПІЛІ Ў МІЛІЦЫЮ

За кіламетр ад мяжы з Расійскай Федэрацыяй на палявой дарозе супрацоўнікі аддзяленне ДАІ Добрушскага РУУС выявілі КамАЗ з паўпрычэпам, гружаны ломам чорнага металу.

Яго кіроўцу, ім быў, дарэчы, гамяльчанін, не пашкасціла: пры пад'ездзе да мяжы ў паўпрычэпе абламалася почапка. Час, страчаны на рамонт, стаў для ўладальніка каштоўнага грузу яго стратай. Аўтамабіль з 20 тонамі металалому для высвятлення абставінаў дастаўлены ў РУУС.

У той жа дзень поспех таксама не быў на баку і жыхара вёскі Краснае Гомельскага раёна, паведаміў спецыяліст па прапагандзе УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Мікалай ГАРБАЧОЎ. На аўтамабілі ЗіЛ-131 ён спрабаваў гэтай жа прасёлкавай дарогай даставіць у Расію 10 тон электрасталеплавільнага шлаку. Маршрут грузавіка, як і ў першым выпадку, быў зменены ў кірунку раённага аддзела міліцыі.

Надзея ДРЫЛА.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 9 июля 2010 года 1-го ТИРАЖА ВЫИГРЫШЕЙ ПО СРОЧНЫМ БАНКОВСКИМ ВКЛАДАМ В БЕЛОРУССКИХ РУБЛЯХ «ШАНС».

Перечень наименований моделей товаров, разыгрываемых в 1-ом тираже выигрышей:

– печь СВЧ Midea AG925EFT, изготовитель СП «Мидеа – Горизонт»;
– стиральная машина СМА 45У84, изготовитель ЗАО «Атлант»;
– холодильник МХМ 1844-67, изготовитель ЗАО «Атлант»;
– телевизор Horizont 42LCD825, изготовитель ОАО «Горизонт».

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2009 г., млн. бел. руб.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2009 год
Вклады до востребования	14,1	73,7	360,4	210,9	168,2	341,1	840,4	968,5	858,2	730,7	994,2	54947,5	60507,8
в том числе: в белорусских рублях	13,5	72,2	358,2	208,5	165,8	337,5	835,2	963,8	852,7	726,5	990,2	54875,4	60399,4
в иностранной валюте	0,6	1,5	2,2	2,4	2,4	3,6	5,2	4,7	5,5	4,2	4,0	72,1	108,4
Срочные депозиты	65366,4	84747,8	99573,7	96978,9	74407,6	103899,5	86888,3	88895,2	93119,3	81314,9	102613,9	128683,1	1106488,8
в том числе: в белорусских рублях	40602,5	55379,7	61011,0	61400,6	41672,6	63738,9	53377,1	55800,9	58435,2	51325,4	70984,0	86554,4	700282,5
в иностранной валюте	24763,9	29368,1	38562,7	35578,3	32735,0	40160,6	33511,2	33094,3	34684,1	29989,5	31629,9	42128,7	406206,3

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 000,00	1 чэшская крона	144,11
▲ 1 еўра	3 684,00	1 польскі злоты	891,76
1 латвійскі лат	5 222,39	▲ 1 расійскі рубель	95,68
1 літоўскі літ	1 070,47	1 украінская грыўня	378,57

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,3538
10 UAH	39,5657
1000 BYR	10,4478
EUR	38,5119

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 мая 2010 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) працягне работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

У БЕЛАРУСІ СКАРЭКТАВАНЫЯ НЕКАТОРЫЯ ЎКАЗЫ ПА ДЭКЛАРАВАННІ ДАХОДАЎ ФІЗІЧНЫМІ АСОБАМІ

У Беларусі скарэктаваныя некаторыя акты кіраўніка дзяржавы ў сувязі з прыняццем закона ад 3 снежня 2009 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў». Адпаведны ўказ № 275 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 25 мая.

У прыватнасці, уносяцца змяненні ва ўказ ад 2 лістапада 2000 года № 577 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні работы з кадрамі ў сістэме дзяржаўных органаў». У новай рэдакцыі выкладаецца форма дэкларацыі, што прадстаўляецца кандыдатам на пасаду або асобай, якая займае пасаду, уключаную ў кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы, або іх мужам (жонкай) і поўнагадовымі блізкімі сваякамі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, у мэтах забеспячэння поўнага адлюстравання ў гэтай дэкларацыі звестак аб даходах і маёмасці і яе ўзгодненасці з палажэннямі закона.

Змяненні ўносяцца таксама ва ўказ ад 19 лютага 2009 года № 105 «Аб некаторых пытаннях, звязаных з дэклараваннем фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў» у частцы выключэння нормаў, якія знайшлі адлюстраванне ў законе. Згодна з дзейнай рэдакцыяй закона адменены абавязак фізічных асобаў прадстаўляць дэкларацыі аб крыніцах грашовых сродкаў, а таксама замацавана права толькі падатковых органаў выпатрабаваць у фізічных асобаў дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Такое патрабаванне падатковыя органы змогуць прад'яўляць як па ўласнай ініцыятыве, так і на падставе пісьмовых запытаў органаў дзяржаўнага кантролю, унутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі і пракуратуры.

Указ уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МЫ — РАЗАМ! Запрашальнік

Ужо ў восьмы раз мерапрыемствы Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур «прызямляюцца» ў старажытным Гродне. І зноў, разам з ужо традыцыйнымі імпрэзамі, чакаюцца навінкі і сюрпрызы.

Свята стартуе 1 чэрвеня тыднем нацыянальнага кіно ў кінатэатры «Кастрычнік», а таксама пленэрам народных майстроў па дрэве ў парку імя Жылібера і выставай мастака Уладзіміра Качана «Лікі нацыі» ў галерэі «Крыга». Урачыстае адкрыццё заключных імпрэзаў фестывалю адбудзецца ўвечары 4 чэрвеня на стадыёне «Нёман» пасля тэатралізаванага шэсця ўдзельнікаў па вуліцах горада. Там жа, на стадыёне, пройдуць канцэрты творчых калектываў нацыянальных аб'яднанняў Беларусі і народнага артыста Расіі Алега Газманава. А на Савецкай плошчы (дзе, дарэчы, на вялікім экране можна будзе назіраць за трансляцыяй урачыстага адкрыцця са стадыёна) выступяць Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь і прафесійныя артысты нашай краіны розных нацыянальнасцяў.

Назаўтра, 5 чэрвеня, на набярэжнай Нёмана адкрыецца «Фантан дружбы», а на Савецкай плошчы і ў парку імя Жылібера свае вырабы прапануюць народныя майстры з Гродзеншчыны і Масквы. З канцэртамі выступяць творчыя дэлегацыі нацыянальных суполак не толькі Прынямоння, але і ўсіх абласцей Беларусі, Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, літоўскі моладзевы сімфанічны аркестр, ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя Росы». А яшчэ нас усіх чакаюць гумарыстычная праграма «Смяяцца не грэх!», свята дзіцячага нацыянальнага мастацтва, конкурсы выканаўцаў нацыянальнай эстрадной песні, у тым ліку сярод дзяцей, моладзевая танцавальна-забаўляльная праграма і «Дыскатэка 80-х»... І, безумоўна, нельга абмінуць ужо традыцыйныя для фестывалю нацыянальныя падворкі.

У нядзелю, 6 чэрвеня, можна завітаць на свята нацыянальных кухняў народаў Беларусі, на свята нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва, а таксама на заключны канцэрт лаўрэатаў фестывалю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Цэны на паслугі ЖКГ — па нумары «175»

Аўтаінфарматар «175», які паведамляе абанентам пра дзейныя тарыфы на электраэнергію, ваду і газ, філіял «Мінская гарадская тэлефонная сетка» РУП «Белтэлекам» запусціў у дзеянне ў сталіцы яшчэ ў 2004 годзе. Але да нядаўняга часу інфармацыя для праслухоўвання была даступная толькі ў імпульсным рэжыме без магчымасці выбару пазіцый.

Для больш зручнага карыстання гэтай паслугай з 1 чэрвеня 2010 года інфармацыю пра тарыфы жыллёва-камунальнай гаспадаркі абаненты пачнуць атрымліваць і ў танальным рэжыме. З дапамогай галасавых падказак можна будзе хутка выбраць для праслухоўвання адзін з трох раздзелаў: тарыфы на электраэнергію, тарыфы на ваду і каналізацыю або тарыфы на прыродны газ. Кошт паслугі складае 77 рублёў за хвіліну. Аўтаінфарматар працуе кругласутачна.

З наведваннем пунктаў рэгістрацыі на ЦТ трэба паспяшацца...

Да заканчэння рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне засталіся лічаныя дні. Па стане на 21 мая рэгістрацыю прайшло ўжо 111 тысяч чалавек (гэта прыкладна на 12 тысяч чалавек менш, чым за адпаведны перыяд мінулага года). У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў нагадалі, што апошні дзень рэгістрацыі — 1 чэрвеня. У апошнюю майскую суботу — 29 мая — пункты рэгістрацыі таксама будуць працаваць з 8 гадзін раніцы да 20 гадзін. А 2 чэрвеня ні ў каго з тых, хто па нейкай прычыне спазніўся, дакументы прымацца ўжо не будуць.

Для рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне абітурыент павінен асабіста падаць заяву на адной з дзвюх дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь (на свой выбар) і дакумент аб унясенні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, а таксама паказаць дакумент, які сведчыць яго асобу (пашпарт, від на жыхарства, пасведчанне бежанца ці афіцыйную даведку, якая выдаецца органамі ўнутраных спраў у выпадку страты ці крадзяжу дакумента, які сведчыць асобу). Вадзіцельскае пасведчанне для рэгістрацыі не падыходзіць. Абітурыенты, якія маюць права на вызваленне ад платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, павінны дакументальна пацвердзіць сваё права на льготу. Сума платы за прыём і афармленне дакументаў складае 10 тысяч рублёў за адзін вучэбны прадмет.

Да заканчэння тэрміну рэгістрацыі абітурыент мае права здаць пропуск ці абмяняць яго на пропуск на іншай дысцыпліне. Пропуск лічыцца зарэгістраваным, калі на ім ёсць пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення тэсціравання, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуску на ЦТ абітурыент можа звярнуцца ў пункт рэгістрацыі, каб атрымаць яго дублікат.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дзве даты

27 мая

1751 год — у Гродне завершана будаўніцтва Каралеўскага палаца (новы замак), помніка архітэктуры сталага барока. Будаўніцтва ішло 18 гадоў. У XVIII стагоддзі сюды з'язджаліся карэты каралёў, сенатараў, паслоў. У лістападзе 1793 года ў Новым замку прайшоў вядомы «маўклівы» ці «нямы» сейм, на якім быў зацверджаны другі падзел Рэчы Паспалітай — падзея, якая канчаткова вызначыла лёс яе існавання. А праз два гады тут жа адмовіўся ад прастола і апошні кароль дзяржавы Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.



1988 год — у СССР прыняты закон аб кааперацыі — праз 60 гадоў у краіне зноў пачало развівацца прыватнае прадпрымальніцтва.

Цытата дня

«Людзі лёгка вераць таму, чаго вельмі жадаюць».

Вальтэр.

Усміхнемся!

У паліклініцы.

— Хто да стаматолага апошні?

— Калі не спалохаюся, будзеце за мной...

☺

Пасля таго, як ён паказаў ёй свой рахунак у банку, яна зразумела, што кахае яго.

☺

Сын і бацька.

— Тата, дай сто рублёў.

— Навошта табе?

— А каб табе было сорамна, што ў твайго дзіцяці толькі сто рублёў.

☺

Праграміст — гэта чалавек, які вырашае цалкам незразумелым вам спосабам праблемы, пра існаванне якіх вы нават не падазравалі.

СЛЕДСТВА ВЯДУЦЬ... СА ЗЛАЧЫНЦАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Размова ідзе пра злачынствы ненасільнага характару (дзе не прычынялася шкода здароўю і жыццю людзей). Ён дадаў, што за мяжой практыкуюцца так званыя здзелкі з правасуддзем, яшчэ больш мяккія падыходы пры вызначэнні пакарання для тых, хто супрацоўнічае са следствам.

У ліку новаўвядзенняў — норма, што дазваляе асобе, якая падазраецца ці абвінавачваецца ва ўчыненні злачынства, самастойна (праўда, не без кантролю праваахоўнікаў) рэалізаваць арыштаваную маёмасць. «Гэта дазволіць хутка пакрываць прычыненую шкоду», — адзначае Генеральны пракурор.

Дэпутат Анатоль ГЛАЗ зноў узняўся на абарону небарак, пазбаўленых волі за хабары па 50—100 тыс. беларускіх рублёў (ён ужо выказваў сваю пазіцыю падчас абмеркавання законапраекта аб амністыі — на іх яна не распаўсюджваецца). — Дэпутат пацікавіўся ў Генпракурора, калі ж у крымінальным заканадаўстве з'явіцца змены, якія дазволяць дыферэнцыяваць хабарнікаў. Ад абяцанняў Р. Васілевіч устрымаўся, аднак ідэйна дэпутата падтрымаў:

— Мая пазіцыя супадае з вашай, — запэўніў Генеральны пракурор, — падыходзіць трэба дыферэнцыявана, разумна, павінна прымацца аптымальнае рашэнне.

Абнадзейвае той факт, што «гэтыя падыходы ў пэўнай ступені будуць закладзеныя» ў Канцэпцыю ўдасканалення мераў крымінальнай адказнасці, якую рыхтуе Генпракуратура. Да першага чэрвеня яе павінны скіраваць кіраўніку дзяржавы. Падыходы падыходамі, а вось як яны будуць успрынятыя іншымі ...

— Мае калегі з Вярхоўнага Суда, прынамсі на ўзроўні намеснікаў, перакананыя, што хабар у 50 долараў — таксама хабар, і ён наносіць велізарную шкоду дзяржаве, — падзяліўся з прысутнымі Р.Васілевіч.

І нават за 50 долараў хабарнікі «расплачваюцца» шасцю, а то і сямю гадамі турмы...

Балазе, што сам Генпракурор прытрымліваецца іншага меркавання — аб неабходнасці падыходзіць дыферэнцыявана, і аб «пераносе цэнтру цяжару на матэрыяльны бок», ці штрафы.

Журналісты ж цікавіліся ў Генпракурора наконт справы аб забойстве касіркі ў абменніку («Звязда» падрабязна асвятляла гэту жудасную падзею). Следства ў найбліжэйшы час вызначыцца з часам перадачы справы ў суд. Сам Генпракурор звяртаўся да справы два тыдні таму.

— Я арыентую пракуратуру Мінска на тое, каб усё было дасканала вывучана, была вызначана віна кожнай службовай асобы — чаму не было створана належных умоў для работы касіра.

Яны, насуперак, былі «ідэальнымі для падрыхтоўкі злачынства», — мяркуе Рыгор Васілевіч. У той жа час наконт пакарання службовых асобаў ён выказваецца стрымана: «Гэта не павінна быць нейкая драканаўская мера», аднак адказнасць яны павінны несці.

ПРЭЧ, ПРАВАКАЦЫЯ

Дэпутаты «за» забарону на падбухторванне аператыўнікамі да супрацьпраўных дзеянняў.

Ніжняя палата парламента падтрымала ў першым чытанні папраўкі ў закон аб аператыўна-вышуковай дзейнасці. Яны забараняюць праваахоўнікам правакаваць (у той ці іншай форме) грамадзян да здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў. Асабліва цікавіліся дэпутаты ў **міністра ўнутраных спраў Анатоля КУЛЯШОВА,** які прадстаўляў законапраект, ці распаўсюджваецца такая забарона на аператыўны эксперымент. Кіраўнік ведамства супакоіў народных абраннікаў:

— Гэтая норма для таго і ўносіцца, каб выкараніць бязладдзе пры правядзенні аператыўных эксперыментаў.

У гутарцы з журналістамі ён удакладніў: заканадаўчыя новаўвядзенні выразна абазначаць, «што мы разумеем пад словам «правакацыя». Яна раней магла трактавацца досыць вольна. Кімсьці — свядома, а кімсьці — з-за размытасці тэрміна, — адзначае міністр. Што ж, цяпер усе кропкі над «і» расстаўленыя.

Падчас гутаркі з журналістамі Анатоль Куляшоў распавёў аб практыцы дактыласкапіявання. Нагадаем, што паводле нядаўніх заканадаўчых змен ваеннаабавязаных абавязалі, — даруйце мне гэтую таўталогію, — яшчэ і да здачы «пальчыкаў». Паводле слоў міністра, праблем не ўзнікае, а тыя, каго абавязалі, да неабходнасці ставяцца «пераважна з разуменнем».

— Грамадзяне разумеюць, што гэта звязана не з нейкай чарговай кампаніяй, а з іх уласнай бяспекай — асабістай, маёмаснай, — перакананы кіраўнік ведамства. — Праблем ніхто з ліку грамадзян нашай краіны нам не стварае.

Ведамства ў сваю чаргу «не імкнецца фарсіраваць працэс», бо на тое «неабходнасці няма». І паводле ацэнкі кіраўніка, усё ідзе ў планавым, спакойным, мяккім рэжыме.

НОВЫ ПАВАРОТ

Пошліны на аўто для фізічных асобаў пасля 1 ліпеня будуць... такімі ж, як і да 1 ліпеня.

Дэпутаты ратыфікавалі пратакол у рамках Мытнага саюза, а журналісты скарысталіся прысутнасцю **старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандра ШПІЛЕЎСКАГА,** каб задаць самае хвалюючае пытанне — пра пошліны на аўто. Першага ліпеня, з увядзеннем у дзеянне Мытнага кодэкса тройкі, дзейны парадак для фізічных асобаў захаваецца.

— У нас з Казахстанам падобныя пазіцыі, аднак Расія настроеная ўвесці для фізічных асобаў пошліны, якія існуюць у дачыненні да юрыдычных асобаў.

На думку старшыні камітэта, да першага ліпеня праблема так і не будзе вырашаная. Трэба меркаваць, гэта будзе выключэнне з рэжыму адзінай мытнай тэрыторыі. «Калі не дамовімся пра іншае», — зазначае спадар Шпілеўскі. Аналагічны лёс у гэтым плане чакае і дамовы па нафце і нафтапрадуктах...

Зоя ВАРАНЦОВА.

Абзац

◢ У Беларусі амаль 2,2 тыс. татаў «працуюць мамамі» — знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Згодна з беларускім заканадаўствам, такое права даецца не толькі бацькам дзіцяці, але і блізкім родзічам. Гэтым правам скарысталіся 265 бабуль і 61 дзядуля.

◢ У Барысаве пры затрыманні злачынцаў паранены супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі, перадае БЕЛТА. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, міліцыя праводзіла затрыманне групы, якая займалася крадзяжамі з аўтамабіляў. Іншыя падрабязнасці пакуль не паведамляюцца.

◢ У выніку ДТЗ у Гродзенскім раёне згарэў пасажыр. 22-гадовы кіроўца ў стане алкагольнага ап'янення не справіўся з кіраваннем «Аўдзі» і ўрэзаўся ў сцяну крамы. Пры гэтым аўтамабіль загарэўся. Мясцовыя жыхары кінуліся на дапамогу пацярпелым. Яны дапамаглі выцягнуць з агню вадзіцеля, ён шпіталізаваны. Аднак дапамагчы выбрацца пасажыру не ўдалося.

◢ Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Віцебскай вобласці затрымалі начальніка Бягомльскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету (Докшыцкі раён) пры атрыманні хабару. Хабар у выглядзе мабільнага тэлефона кіраўнік інспекцыі вымагаў у спецыяліста адной з дзяржустаноў, які дапусціў парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства. За ўзнагароджанне начальнік абяцаў не накіроўваць па месцы працы парушальніка паведамленне аб адміністрацыйным пакаранні, перадае БЕЛТА.

Поўны абзац

◢ Пасажыр электрычкі праехаў сваю станцыю з заціснутай дзвярыма галавой. Мужчына ехаў у электрычцы Масква—Моніна Яраслаўскага напрамку і быў нецвярозы. Ён хацеў выйсці на станцыі Цыялкоўская, аднак спатыкнуўся, пасля чаго яму заціснула галаву дзвярыма, якія зачыніліся. Дапамагчы вызваліцца яму змаглі толькі на наступнай станцыі, бо пасажыраў на той час у электрычцы было мала і крыкаў аб дапамозе ніхто не чуў, тым больш што галава апынулася не ў вагоне. Як сказаў пацярпелы, стан яго здавальняючы. Пасля свайго «вызвалення» мужчына адправіўся ў касы купляць білет у зваротным напрамку.



◢ Амерыканец паклікаў каханую замуж татуіроўкай. Жыхар Сан-Дыега Джо Уітэнберг зрабіў прапанову сваёй дзяўчыне, зрабіўшы на сваёй назе татуіроўку ў выглядзе пытання: «Рэйчал, ты выйдзеш за мяне?» Джо працуе тату-майстрам, таму «набіў» пытанне на сваім целе самастойна. Па словах амерыканца, папярэдне ён зрабіў спецыяльны шаблон, каб татуіроўка была роўнай і акуратнай. Па заканчэнні працы ён паказаў надпіс каханай. Тая адказала згодай. Яе адказ — «Вядома!» — таксама вытатуяваны на назе нарачонага.

◢ Эксперыментальная прадуктовая крама адчынілася ў новазеландскай сталіцы Уэлінгтан. Тут тавары адпускаюцца абсалютна бясплатна. Асартымент даволі разнастайны. Усе тавары паступаюць на паліцы з іншых супермаркетаў — рэшткі, якія не паспяваюць быць прададзенымі да заканчэння тэрміну прыдатнасці. Незвычайная крама будзе працаваць на працягу двух тыдняў. Ці маюць бясплатныя крамы будучыню, пакажа час.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Брестская областная организация ООБО «Книга» **сообщает о ЛИКВИДАЦИИ. Претензии принимаются в течение 2-х месяцев со дня публикации по тел. 722 31 30.**

Учреждение образования
«МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ АВИАЦИОННЫЙ КОЛЛЕДЖ»

ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС НА ЗАМЕЩЕНИЕ ВАКАНТНЫХ ДОЛЖНОСТЕЙ ПО КАФЕДРАМ:

1. «Техническая эксплуатация радиоэлектронного оборудования»:
- заведующий кафедрой — 1;
- доцент — 2;
- преподаватель — 1.

2. «Организация движения на воздушном транспорте»:
- доцент — 2;
- старший преподаватель — 2.

3. «Техническая эксплуатация авиационного оборудования»:
- заведующий кафедрой — 1;
- доцент — 2.

3. «Техническая эксплуатация воздушных судов и двигателей»:
- заведующий кафедрой — 1;
- старший преподаватель — 2;
- преподаватель — 1.

4. «Общетехнические дисциплины»:
- профессор — 1;
- доцент — 1;
- старший преподаватель — 2;
- преподаватель — 1.

5. «Естественно научные дисциплины»:
- доцент — 4;
- старший преподаватель — 3.

6. Английского языка:
- заведующий кафедрой — 1;
- доцент — 1.

7. «Социально-гуманитарные дисциплины»:
- заведующий кафедрой — 1;
- профессор — 1;
- доцент — 2;
- старший преподаватель —1;
- преподаватель — 1.

УНП 100005688

БЕЛАРУСЬ ПРАЙШЛА Ў ФІНАЛ КОНКУРСУ. ЦЯПЕР ХОЧАЦЦА БОЛЬШАГА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Крыўдна, але за бортам сёлета засталіся практычна ўсе выступленні з элементамі фолку — не ўпадабалі чамусьці гледачы ні завадных басаногіх прыпевачніц з Фінляндыі, ні тэатралізаваныя танцы з распрананнем Польшчы, ні рамантычныя спевы дрыяды са Славакіі. Затое прайшлі песні, скажам так, тыповыя — тыповыя балады, тыповы рок, тыповы дэнс для дыскатэк (прывітанне грэку Гіёргасу Алкеасу і ягонай «Опе»). Затое з гэтага пункта гледжання выбар Беларусі павольнай кампазіцыі з элементамі класікі і галівудскага саўндтрэка трапіў у яблычка. Зрэшты, расслабляцца рана — прыгожых балад і моцных галасоў на сёлетнім конкурсе хапае.

Адразу пасля паўфіналу большасць тэлегледачоў адправілася спакойна спаць, а дзясятка цяпер ужо фіналістаў — на прэс-канферэнцыю і жараб'ёўку парадку выступленняў 29 мая. Гурту «3+2» дастаўся нумар 9, Пётр Наліч і кампанія сплюнуць па Расію пад нумарам 20. Таксама, нагадаем, у фінале ўжо зарэзерваваныя прадстаўнікамі «вялікай чацвёркі» і леташняй краіны-пераможцы нумары 2 (Іспанія), 3 (Нарвегія), 12 (Вялікабрытанія), 18 (Францыя) і 22 (Германія). Яшчэ 10 пазіцый будуць разыгрыныя сёння ноччу паміж 17 ахвотнымі з другога паўфіналу.

Дарэчы, ён, не ў крыўду нікому, абяцае быць значна цікавейшым за першы. Па-першае, тут выступаюць адразу некалькі фаварытаў сёлетняга «Еўрабачання»: адзін з самых сімпатычных удзельнікаў конкурсу Харэль Скаат з Ізраіля і дзве гарачыя ўсходнія дзяўчыны — Сафура з Азербайджана і Ева Рывас з Арменіі, (прычым канкурэнцыя паміж апошнімі перарасла ў нежартоўную дуэль паміж краінамі-удзельніцамі — па чутках, у выпадку перамогі адной другая налета збіраецца адмовіцца выступаць увогуле). Па-другое, сярод канкурсантаў заўважаныя двое старажылаў. Спявачка Ніам Кавана з Ірландыі ўжо прыносіла перамогу сваёй краіне ў 1993-м, дый сёлета яна мае намер паказаць, што ў свае 42 яшчэ тая ягадка і канкурэнтка для маладых. Дзявочае трыа «Feminnem» з Харваты знаёмае нам па 2005 годзе — праўда, тады дзяўчаты выступалі за Боснію і Герцагавіну і нічога асаблівага не дасягнулі; цяпер жа, крыху змяніўшы склад і абраўшы песню па сваім канале, спадзяюцца на ўдачу. Нарэшце, па-трэцяе, песні і нумары ў другім паўфінале больш яркія і рознахарактарныя, хоць і яны скарыліся перад мінімалізмам нарвежскіх пастаноўшчыкаў. Гаспадыня «Еўрабачання-2010» відавочна вырашыла не шыкаваць падчас крызісу і выдаткавала на конкурс усяго 150 мільёнаў нарвежскіх крон, або каля 17 мільёнаў еўра (для параўнання — леташні конкурс абышоўся Маскве ў 24 мільёны еўра). Затое — нічога лішняга, атрымаўся выключна конкурс, а не пафасны пыл у вочы...

ПАЎДНЯ ПЕРАДЫШКІ

Другі паўфінал беларусы паглядзяць выключна ў якасці балельшчыкаў — у ім мы не галасуем і паўплываць на вынікі не можам. А чым у гэты час будзе займацца гурт «3+2» — выканаўцы скарыстаюцца невялікай перадышкай або з новымі сіламі прыступяць да рэпетыцый са шведскім піяністам Робертам Уэлсам і, магчыма, штосьці падкарэктуюць у сваёй пастаноўцы?

— Перадышка была, але вельмі невялікая, літаральна да абеду, — расказаў «Звяздзе» **першы намеснік старшыні праўлення АНТ Сяргей ХОМІЧ,** які знаходзіцца ў Осла. — Потым зноў пачалася праца — гэта і рэпетыцыі, і стасункі з журналістамі, прамацыраванне нашай конкурснай песні.

— У паўфінале вы адмовіліся ад некаторых элементаў пастаноўкі — дымавых эфектаў і канфеці. Нам падалося, што без іх нумар выглядаў крыху сумнавата. У фінале штосьці зменіцца?

— Яшчэ не думалі пра гэта, але кардынальна мяняць нічога не будзем, на 99 працэнтаў пастаноўка застанецца такой, як была.

— Падчас трансляцыі здавалася, што ў гурта былі невялікія вакальныя праблемы — у нашых выканаўцаў усё ў парадку з галасамі?

— Яны кажуць, што па самаадчуванні ва ўсіх усё нармальна. А ўвогуле там многія не траплялі ў танальнасць. Я стаяў падчас выступлення за сцэнай, з аднаго боку чуў гук, што ішоў з залы, а з другога — з экранаў, сумарная якасць была вельмі дрэнная, таму меркаваць пра гэта не магу.

— Ці будзеце вы глядзець другі паўфінал і падтрымліваць кагосьці?

— Хто захоча, той, безумоўна, пойдзе глядзець, а перажываць кожны будзе па сваіх асабістых сімпатыях. Мне, напрыклад, падабаецца Данія, Егіязар, напэўна, будзе хварэць за Арменію, некаторым удзельнікам дэлегацыі падабаецца Ізраіль...

Галоўнае цяпер, мяркую, каб ніхто з беларускіх артыстаў не захварэў насамрэч і каб у суботу 29 мая іх конкурсная песня «Butterflies» зачаравала сваім музычным палётам не толькі землякоў, але і еўрапейскую публіку. Першы крок у іх ужо атрымаўся, чаму б не пайсці далей?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЗАХАВАЦЬ СВОЙ ТВАР

Царква адкрывае дыскусію вакол выкладання рэлігіі ў школе

26 мая ў Мінску адкрыліся XVI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія Чытанні, якія прысвечаныя тэме ўвядзення ў школах Беларусі новага прадмета — рэлігійнай культуры. Беларусь засталася адной з нямногіх еўрапейскіх краін, дзе ў тым альбо іншым выглядзе інфармацыю аб сусветных рэлігіях не даюць дзецям у рамках сеткі школьных заняткаў. Каб выправіць гэту сітуацыю, у сёлетнім красавіку Беларуская праваслаўная царква накіравала прапанову кіраўніцтву Парламента Рэспублікі Беларусь аб унясенні адпаведных зменаў у закон «Аб адукацыі» . Пра тое, навошта нашым дзецям патрэбна веданне рэлігійнай культуры не столькі іх бацькоў, колькі дзядоў, ці нават прадзедаў, і на якім этапе знаходзіцца ажыццяўленне новага адукацыйнага праекта, мы распыталі першага намесніка старшыні Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірылы» (Цэнтр з'яўляецца арганізатарам і фундатарам Чытанняў) і кіраўніка Цэнтра Міжнародных сувязяў і развіцця багаслоўскай адукацыі Інстытута тэалогіі БДУ Рыгора ДАЎГЯЛУ.

— Сёлетнія Чытанні закліканыя адкрыць грамадскую дыскусію па пытаннях увядзення урокаў рэлігійнай культуры ў школах Беларусі. Публічнае абмеркаванне гэтай тэмы ў нашай краіне адбываецца ўпершыню?

— У такіх маштабах, з прыцягненнем вялікай колькасці спецыялістаў, упершыню пытанне абмяркоўвалася ў рамках пасяджэнняў сумеснага каардынацыйнага савета Міністэрства адукацыі і Беларускай праваслаўнай царквы. Вынікам стала з'яўленне факультатыўных курсаў з зацвярджанымі планамі «Асновы праваслаўнай культуры», «Духоўныя асновы культуры» і «Культура і рэлігія» ў шэрагу школ Мінска і Мінскай вобласці.

Такім чынам, ёсць прыклады таго, якім выкладанне рэлігійнай культуры можа быць па змесце. Але — не па форме. Бо факультатыў знаходзіцца па-за сеткай вучэбных гадзін і таму не дасць таго эфекту, які могуць даць урокі ў рамках вучэбнага працэсу.

— Калі прадстаўнікі Царквы ўжо абмяркоўвалі магчымасць увядзення ў школах урокаў па рэлігійнай культуры, то, напэўна, чулі і аргументы апанентаў. Якія з іх найбольш важкія?

— Адзін з галоўных аргументаў — адсутнасць кваліфікаваных кадраў настаўнікаў, якія могуць выкладаць такія ўрокі. Але сёння кадры ўжо ёсць. Інстытут тэалогіі, які існуе з 1993 года (тады ў фармаце факультэта, а з 2005 года — у складзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта), выпусціў дастаткова для першага этапу армію дыпламаваных спецыялістаў, якія маюць права выкладаць у сярэдняй школе і якія з задавальненнем падключацца да праекта. Думаю, падобных спецыялістаў знойдуць і Каталіцкая царква, іудзейскія і мусульманскія абшчыны. Але, сапраўды, адразу, акордна, па ўсёй краіне ўвесці такія ўрокі было б праблематычна. У гэтым мы пагаджаемся з нашымі апанентамі.

Але і тут ёсць выйсце. Галоўнае — вырашыць задачу прынцыпова. Для гэтага можна ўвесці гады на тры статус эксперымента. Напрыклад, пачаць выкладанне новага прадмету ў некалькіх школах кожнага з абласных цэнтраў і ў некалькіх школах кожнай вобласці на перыферыі. На працягу трох гадоў адпрацаваліся б методыка, механізмы, улічыліся б усе станоўчыя і адмоўныя моманты, падрэдагаваліся вучэбныя планы, адшліфаваліся падручнікі. Пасля чаго можна было б увесці ўрокі рэлігійнай культуры па ўсёй краіне. Пазіцыя Царквы па гэтым пытанні дастаткова гнуткая і цвярозая.

— Падобным чынам паступіла Расія. Вучэбны прадмет «Асновы рэлігійных культур і свецкай этыкі» там ужо эксперыментальна ўключаны ў школьную праграму ў 19 рэгіёнах, а праз два гады яго плануецца ўвесці па ўсёй краіне. Што з практыкі суседзяў мы ўжо можам улічыць?

— Сёння зразумела адно: выкладанне з 1 красавіка 2010 года ў расійскіх школах асноў рэлігійных культур было правільным рашэннем. Гэта адказ на выклік часу. Бацькі гэта ўспрынялі станоўча. Безумоўна, працэнт тых, хто запісаўся на ўрокі праваслаўнай культуры, урокі іншых рэлігійных культур, у тым ліку на ўрокі свецкай этыкі, у розных рэгіёнах адрозніваецца. Гэта залежыць ад сітуацыі ў сістэме адукацыі кожнага канкрэтнага рэгіёну. Пра гэта ёсць ужо артыкулы і водгукі ў СМІ. Ёсць дыскусіі з нагоды падручнікаў. Але самае галоўнае, што гэта ўжо канструктыўныя дыскусіі — працэс пайшоў, і размова ідзе не пра тое, як забараніць эксперымент, а пра тое, як яго палепшыць.

Напэўна, адзін з самых галоўных вынікаў на сёння: дзеці павінны чуць з вуснаў настаўнікаў не толькі абстрактныя мадэлі маральных імператываў, але, галоўным чынам, факты, якія існуюць ў гісторыі і адносяцца да той ці іншай рэлігіі. Напрыклад, факты біблейскай гісторыі, жыццеапісанні біблейскіх персанажаў, іх учынкі, памылкі, маральныя ўрокі, якія яны робяць самастойна альбо па натхненні зверху. Вельмі важна пачынаць з жывых, з пункту погляду літаратурнага помніка, людзей.

Дарэчы, тут Беларусь не адстае ад Расіі, а нават апераджае. Бо выпускнікі Інстытута тэалогіі Святлана Мандрык і Андрэй Гаранскі падрыхтавалі падручнік «Біблія як помнік культуры» — добрае ілюстраванае выданне, якое выйшла ў выдавецтве «Зорны верасок» у 2009 годзе. Кніга мае статус падручніка і можа выкарыстоўвацца на эксперыментальных пляцоўках, пра што сведчыць грыф Міністэрства адукацыі на яе тытуле. Гаранскі і Мандрык якраз пайшлі па шляху аповеду не пра абстрактныя схемы, а пра канкрэтных гістарычных асобаў, жыццёвыя гісторыі. Так дзецям лягчэй зразумець прадмет размовы.

— Такім чынам, мы маем ужо нейкі задзел...

— Так, прэцэдэнты ёсць, і не толькі ў Мінску і Мінскай вобласці, а практычна ва ўсіх абласцях. Яны ёсць і ў каталікаў. Мы не кажам пра нейкую манаполію. Размова ідзе пра тое, што ў Беларусі неабходна стварыць сістэму, у якой маглі б рэалізаваць свае адукацыйныя праграмы ўсе гістарычныя рэлігіі і канфесіі.

— Аднак што скажуць бацькі, наконт яшчэ большай загружанасці дзяцей? І як сустрэнуць навіну школьныя педагогі, якія не толькі выхоўваліся ў атэістычным грамадстве, але і на сваіх уроках часта адмаўляюць існаванне Бога?

— На мой погляд, рэальнай перагружанасці дзяцей у школе няма і вучэбны план там дастаткова збалансаваны. Пацвярджэнне таму — скаргі многіх бацькоў на скарачэнне шэрагу дысцыплін. Думаю, сацыялагічнае апытанне пацвердзіла б гэта. У верасні 2009 года падчас ток-шоу «Выбар» у прамым эфіры на пытанне «Ці неабходная вашым дзецям духоўная адукацыя?» 88 працэнтаў гледачоў адказала: «Так». Цікава і тое, што сярод іх былі атэісты. Гэтыя людзі ўпэўненыя, што іх дзіця атрымае нейкую прышчэпку маралі і мудрасці, калі будзе наведваць такія ўрокі. І ніхто не пярэчываў наконт дадатковай нагрузкі. Наадварот, многія аддалі б перавагу таму, каб іх дзіця было трохі загружана такімі ўрокамі, чым праседжвала гэты час у інтэрнэце.

Што датычыцца настаўнікаў, сапраўды, часта іх трымаецца атэістычных поглядаў. Але другая частка — вітае выкладанне ў школе рэлігійнай культуры. Мы кантактуем з рознымі школамі і бачым, наколькі дырэктары і настаўнікі самі з задавальненнем прыходзяць на нашы сустрэчы, прыводзяць сваіх уласных дзяцей. Таму тут не адбудзецца гульні ў адны вароты.

Будуць як станоўчыя, так і адмоўныя водгукі, але яны будуць да таго часу, пакуль мы не паспрабуем, пакуль не пакажам, што ў духоўнай адукацыі няма нічога страшнага. Калі вы не хочаце, каб ваша дзіця наведвала такія ўрокі, альбо калі вы не хочаце выкладаць такі прадмет — калі ласка. Таму вельмі важна, каб урокі рэлігійнай культуры выкладалі настаўнікі, якія зацікаўленыя ў поспеху праекта.

Мы настойваем на тым, каб права выкладаць прадмет мелі

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 мая 2010 г. № 20 (214)

ЗАРАБІЦЬ І ПЕНСІЮ, І СТАЖ

Такі шанц з'явіўся ў людзей з абмежаванымі магчымасцямі

У адрозненне ад «савецкіх» часоў, калі ці не адзіным шляхам для людзей з цяжкімі захворваннямі ў рэшце рэшт аказваўся дом-інтэрнат, сёння ёсць шмат іншых варыянтаў. Можна ўзгадаць пра сядзелак. Або пра магчымасць атрымліваць сацыяльныя паслугі на даму.

Вось толькі ці здымаюць падобныя альтэрнатывы адразу ўсе праблемы — таксама пытанне. Бо не сакрэт, што тая ж сядзелка па кішэні далёка не кожнаму, а візіты сацыяльнага работніка — гэта ўсяго некалькі гадзін на працягу тыдня. Таму з'явілася рашэнне: распачаць пры раённых тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва стварэнне аддзяленняў для дзённага знаходжання інвалідаў. Прычым, насуперак скептыкам, на такія аддзяленні паступова з'явіўся попыт.

Пакінуць чатыры сцяны

Прычын можа быць шмат: паталогіі пры нараджэнні, дарожна-транспартныя здарэнні, нечаканыя «бытавыя» траўмы пазваночніка, рук або ног і нават памылкі медыкаў — «перадазіроўкі» лекамі. Вынікі ж часцяком становяцца вельмі падобнымі — сур'ёзныя праблемы са здароўем. Сапраўды, амаль палова інвалідаў Валожынскага раёна ва ўзросце ад 18 да 31 года мае магчымасць вучыцца і працаваць. Але ёсць і другая палова — і ёй патрэбны пастаянны догляд. Прычым тут многія сем'і робяць адназначны выбар не на карысць «традыцыйных» інтэрнатаў.

— У раёне больш за 40 маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі жывуць разам з бацькамі, і ў любым выпадку менавіта гэты варыянт заўсёды будзе самым лепшым, — адзначае загадчык аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Валожынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ларыса Шчарбачэвіч. — Бяда ў адным: бацькі ўсё ж не вечныя. І рана ці позна прыйдзе час, калі інваліду спатрэбіцца вырашаць свае праблемы самастойна.

Для пачатку да магчымасці наведваць аддзяленне дзённага знаходжання сёй-той з бацькоў паставіўся з недаверам — баяліся адпускаць дзяцей. Але некаторыя ўсё ж вырашылі паспрабаваць. І прыклад апошніх спрацаваў. Сёння аддзяленне рэгулярна наведвае 20 чалавек — як непасрэдна з Валожына, так і з раёна. Каб вырашыць праблему з уласным транспартам, прыйшлося шукаць спонсараў. А некалькі чалавек дабіраюцца да тэрытарыяльнага цэнтра самі, штодня пераадольваюць шлях у паўсотні кіламетраў — балазе, знаходзіцца аддзяленне недалёка ад аўтавакзала, а трымаць сітуацыю пад кантролем дазваляе мабільная сувязь.

— Нікога прымушаць нельга, наведванне аддзялення магчыма толькі па жаданні, — адзначае Ларыса Шчарбачэвіч. — Прычым бацькі ўжо разумеюць, што іх дарослыя дзеці знаходзяцца пад наглядам, а, значыць, у тых жа маці нарэшце з'яўляецца шанц выйсці з чатырох сцен, спакойна парабіць хатнія справы, а то і працаўладкавацца. Прычым мы пайшлі крыху далей і стварылі бацькоўскія клубы. Час ад часу ў клубы запрашаюцца юрысты, ладзяцца кансультацыі па льготах, падатках, жыллёвым заканадаўстве. Але ці не самае галоўнае — бацькі збіраюцца разам, а ім, людзям з аднолькавай бядой, заўсёды ёсць пра што адзін аднаму расказаць. Дарэчы, чамусьці распаўсюджаная думка, што дзеці-інваліды нараджаюцца толькі ў алкаголікаў, вельмі далёкая ад праўды. Больш за 80 працэнтаў такіх сем'яў якраз цалкам нармальныя, і чаму ў іх з'явілася дзіця з парушэннямі здароўя, не ведае ніхто.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЕЗ ЧАСУ НА «РАСКАЧКУ»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вяскоўца не павінна балець галава аб тым, як набыць карову

Вынікі нарады па пытаннях развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян, якая адбылася ў Прэзідэнта 18 мая, сёння, бадай, адна з самых гарачых тэм, якія абмяркоўваюцца прадстаўнікамі мясцовай улады Смалявіцкага раёна.

У старшыні раённага Савета дэпутатаў Аляксандра Ляхоўскага пытаюся наконт яго ўражанняў ад нарады, у прыватнасці, пра тое, што яго асабіста «зачапіла».

— Першае і асноўнае, — гаворыць Аляксандр Аляксандравіч, — на сто працэнтаў згодны з тым, што неабходна распрацаваць дакладную і рэальную праграму па падтрымцы і развіцці асабістых гаспадарак. І абавязкова кантраляваць ход яе выканання. Трэба, каб яна была напісана зразумелай і даступнай мовай, утрымлівала дасягальныя мэты і задачы. Каб кожнаму вяскоўцу, які захоча з ёй пазнаёміцца, быў бачны яе эканамічны і сацыяльны змест, агульная карысць ад рэалізацыі, — гаворыць Аляксандр Аляксандравіч.

— У новым складзе раённага Савета амаль палова новых дэпутатаў. З дзевяці старшынь сельскіх Саветаў чатыры — новыя кіраўнікі, таксама амаль 50 працэнтаў. Хоць у мясцовую ўладу прыйшлі людзі ў раёне вядомыя, якія тут жывуць не першы год, ведаюць яго праблемы, аднак пэўны тэрмін на ўваходжанне ў сутнасць спраў райсавета і сельскіх Саветаў усё ж неабходны. Але ведаеце, нарада ў Прэзідэнта па пытаннях развіцця падсобных гаспадарак, вострая крытыка кіраўніком дзяржавы дзейнасці ці, правільней сказаць, бяздзейнасці сельскіх Саветаў на гэтым накірунку, пастаўленыя ім задачы не пакінулі часу на разварушванне. Прыйшлося ўсім адразу брацца за справу.

Як, дарэчы, і яму самому. Ляхоўскі стаў старшынёй Смалявіцкага раённага Савета нядаўна, падчас выбарнай кампаніі ў мясцовыя Саветы. Дагэтуль працаваў старшынёй Пліскага сельскага Савета, быў вылучаны на пасаду загадчыка агульнага аддзела райвыканкама. Балаціраваўся ў дэпутаты раённага Савета, прайшоў і на першай сесіі райсавета яго абралі старшынёй.

— Ведаеце, нам, прадстаўнікам мясцовай улады раённага звяна, вялікую падтрымку аказаў Мінскі аблвыканкам, па ініцыятыве якога ў Любані прайшла аператыўна арганізаваная абласная нарада па развіцці асабістых падсобных гаспадарак. У Любанскім раёне даволі нядрэнна пастаўлена праца з насельніцтвам па гэтым пытанні, нам было цікава вывучыць досвед органаў мясцовай улады. Там на тэрыторыі аднаго з сельсаветаў вяскоўцамі ўтрымліваецца аж тысяча кароў! Асобныя падыходы органаў мясцовай улады Любаншчыны мы мяркуем пераняць, — кажа старшыня райсавета.

У чым спецыфіка Смалявіцкага раёна? У набліжанасці да сталіцы. Шмат яго жыхароў штодзень едуць на працу ў Мінск. Зразумела, весці з імі гаворку аб карысці вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі даволі праблематычна. Але гэта не значыць, што ў раёне няма зацікаўленых гэтай тэмай. Аляксандр Аляксандравіч лічыць, што трэба часцей сустракацца з людзьмі, ведаць іх праблемы — у прыватнасці, з утрыманнем свойскай жывёлы і птушкі, здачай лішкаў малака і мяса. А з другога боку, быць у кантакце з кіраўнікамі гаспадарак, ад якіх у значнай ступені залежыць закуп сельгаспрадукцыі з вясковых двароў.

У раёне ёсць свае лідары па закупцы малака ад насельніцтва. Напрыклад, Курганскі сельсавет, які мяжуе з Чэрвеньскім раёнам. Гэта вынік намаганняў і мясцовай улады таксама.

Але блізкасць вялікага горада мае і свае плюсы для развіцця падсобных гаспадарак. Усё больш запатрабаванымі становяцца паслугі аграрнага турызму, шмат мінчан на выхадныя наведваюць мясцовыя агрысядзібы, любяць паласавацца вясковым экалагічна чыстым малаком «з-пад каровы», мяснымі прысмакамі, выраблянымі па рэцэптуры бабуль. Чым не перспектыўны рынак збыту?

У перспектыве таксама выгадным рынкам збыту лішкаў сельгаспрадукцыі вяскоўцаў стануць жыхары будучага горада-спадарожніка на 20 тысяч чалавек, які плануецца ўзвесці ў Смалявіцкім раёне. Чаму б у яго цэнтры не пабудаваць сваю міні-Камароўку, дзе б гандлявалі свежымі прадуктамі харчавання? Свайго пакупніка знойдзе садавіна і гародніна з падсобных гаспадарак. Напэўна, гіпермаркет у горадзе-спадарожніку будзе вельмі дарэчы — куды сёння без гэтага сучаснага прадпрыемства гандлю?

Але цікава выглядаў бы і рынак у нацыянальным стылі на фоне гарадской архітэктуры. Ды і канкурэнцыя за пакупніка паміж гіпермаркетам і рынкам можа ўдала паўплываць на цэны, на якасць абслугоўвання насельніцтва.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Галоўны капітал

Да 90-х гадоў мінулага стагоддзя пад сацыяльнай палітыкай разумелі сацыяльную абарону пэўных груп людзей і задавальненне патрэб насельніцтва. Аднак паступова гэтае паняцце змянілася, і сёння сацыяльная палітыка вызначаецца як сістэма мер, скіраваная не толькі на павышэнне дабрабыту, паляпшэнне якасці жыцця людзей, але і на развіццё чалавечага патэнцыялу, забеспячэнне стабільнасці, недапушчэнне сацыяльных канфліктаў і дасягненне сацыяльнай згоды ў грамадстве.

З гэтага пачала сваё выступленне перад старшынямі сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў 26 склікання, якія прыехалі ў Мінск павышаць кваліфікацыю, **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Антаніна МОРАВА**.

Яна нагадала, што якасць жыцця народа вызначана прыярытэтным кірункам нашай краіны на наступную пяцігодку. Само паняцце «якасць жыцця» з'явілася ў нас не так даўно, адзначыла выступоўца. Пра якасць жыцця народа ўпершыню пачалі гаварыць падчас апошняй пяцігодкі, а да гэтага ў асноўным выкарыстоўвалася паняцце «ўзровень жыцця» і «ўзровень дабрабыту». У праграме на новую пяцігодку якасць жыцця становіцца цэнтральнай тэмай.

У цэлым па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь займае 68 месца (лідар сярод краін СНД!)

— Якасць жыцця — гэта мера індывідуальнай даступнасці да ўсяго, што мае грамадства (аховы здароўя, адукацыі, жыллёва-камунальных паслуг, культуры, навукі і інш.). Якасць жыцця мы сталі павышаць з дапамогай стандартаў, якія ўводзім у азначаных галінах. І вы, як старшыні сельскіх, пасялковых Саветаў, павінны займацца гэтым у першую чаргу.

Акрамя выканання сацыяльных стандартаў, паляпшэнне якасці жыцця прадугледжвае рост даходаў насельніцтва (аплаты працы, пенсій), удасканаленне працоўных стасункаў, сацыяльную абарону сям'і, развіццё сацыяльна-культурных галін, умацаванне здароўя нацыі і інш.

У сваім выступленні Антаніна Морава неаднаразова спасылалася на Пасланне Прэзідэнта да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. У прыватнасці, яна нагадала, што адной з самых важных мэтаў нашай дзяржавы вызначана павышэнне ўзроўню развіцця чалавечага патэнцыялу, пастаўлена задача ўвайсці ў пералік 50 краін свету з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу.

У 90-х гадах мінулага стагоддзя два шведскія вучоныя Тэадор Шульц і Гэры Бэкер атрымалі Нобелеўскую прэмію па эканоміцы за ўвядзенне новага паказчыка — «індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу». На прыкладзе 192 краін свету яны даказалі, што развіццё любой дзяржавы на 64 працэнты залежыць менавіта ад развіцця чалавечага капіталу (ведаў, здольнасцяў, узроўню адукацыі кожнага грамадзяніна), толькі на 20 працэнтаў — ад фізічнага капіталу і яшчэ менш — ад прыродных фактараў.

Індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу складаецца з трох асноўных кампанентаў: працягласці жыцця, узроўню адукацыі і рэальнага душавога валавога ўнутранага прадукту па парытэту пакупніцкай здольнасці. У цэлым па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь займае 68 месца (лідар сярод краін СНД!) А па асобных кампанентах нашы вынікі яшчэ лепшыя. Напрыклад, па ўзроўні адукацыі мы на 33 месцы.

Па працягласці жыцця мы апярэдзілі Расію (Беларусь на 106 месцы, Расія на 142-м).

— Дзякуючы праграме дэмаграфічнай бяспекі, мы на паўгода павысілі працягласць жыцця. Гэта таксама вельмі добры вынік. Мы і надалей будзем працаваць у гэтым кірунку, — адзначыла Морава.

Паводле апошніх звестак, самая высокая працягласць жыцця ў еўрапейскай Андоры (85 гадоў), на другім месцы Японія (83 гады), за ёй ідуць Ганконг, Ісландыя, Швейцарыя.

А вось па рэйтынгу раўнапраўя палоў, які таксама ўлічваецца пры разліку індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу, Беларусь 34-я. Па прадстаўніцтву жанчын у органах заканадаўчай улады мы 19-я (паводле вынікаў апошніх выбараў у мясцовыя Саветы, жанчыны склалі 45,5 працэнта ўсіх дэпутатаў. У Нацыянальным сходзе жанчын звыш 30 працэнтаў.) Цікава, што першае месца па прадстаўніцтве жанчын у органах улады ў... афрыканскай Руанды, дзе з-за 15-гадовых войнаў значна скарацілася мужчынская насельніцтва.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Андрэй НАВУМОВІЧ:

«Рашэнні трэба прымаць, зыходзячы з сітуацыі ў кожным рэгіёне»

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

А пытанняў, што патрабуюць увагі дэпутатаў сельскіх, раённых, абласнога Саветаў дастаткова — толькі працуй, даражы даверам выбаршчыкаў. У гэтым перакананы новы старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Андрэй НАВУМОВІЧ. Андрэю Мікалаевічу 46 гадоў, ён закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут і Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, намеснікам старшыні Карэліцкага райвыканкама. Апошняя пасада — старшыня Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў.

— Калі казаць пра склад дэпутацкага корпуса абласнога Савета новага склікання, то галоўнае, на маю думку, у тым, што там сабраліся прафесіяналы, якія заслужылі давер выбаршчыкаў. І гэтым даверам трэба даражыць, адпрацоўваць яго. У першую чаргу — у той акрузе, дзе дэпутатам балаціраваўся.

— У сувязі з гэтым можна задумацца аб прычынах няўдач некаторых кандыдатаў у дэпутаты падчас сёлетніх выбараў у мясцовыя Саветы...

— Сапраўды, былі выпадкі, калі чалавек ішоў у дэпутаты без альтэрнатывы, здавалася б, павінен быць стапрацэнтны выйгрыш, аднак не хапіла неабходнай для выбрання колькасці галасоў выбаршчыкаў. Гэта сведчыць пра тое, што нічога, скажам так, «прахаднога» няма, трэба заслужыць аўтарытэт. І асабістыя і прафесійныя якасці павінны быць галоўнымі паказчыкамі пры вылучэнні кандыдатам у дэпутаты. А стаў дэпутатам — даказвай людзям, што яны не памыліліся ў сваім выбары, вырашэннем тых праблем, якія ёсць у населеных пунктах. Тым больш што дэпутацкі статус сёння дазваляе звярнуцца з запытам, прапановай практычна ў любы орган улады.

Дэпутатам усіх узроўняў і старшыням Саветаў трэба працаваць на апярэджанне. У якім плане? Не замыкацца на пасяджэннях, кабінетнай працы, а проста выязджаць і сустракацца з людзьмі. Пэўнае кола пытанняў будзе знімацца адразу ж, у той жа дзень. А іншыя пытанні павінны ставіцца перад тымі ці іншымі органамі, а іх вырашэнне — браць пад кантроль. Тым самым зменшыцца паток скаргаў (не люблю гэтае слова, але ж так і ёсць) у абласныя і рэспубліканскія інстанцыі.

— Ці вызначыліся ўжо з прыярытэтамі працы абласнога Савета на бліжэйшую перспектыву?

— На мой погляд, жорсткіх, так бы мовіць, «правілаў гульні» тут быць не павінна. Трэба дакладна адсочваць сітуацыю, якая складваецца на тэрыторыі кожнага рэгіёна і, зыходзячы з гэтага, прымаць адпаведныя рашэнні. Магчыма, у нейкім раёне ў гэтым паўгоддзі неабходна больш паглыблена папрацаваць у адным накірунку, у нейкім — іншы прыярытэт.

Скажам, у адным з раёнаў значна ўзрасла колькасць пажараў. Чаму? Натуральна, гэта пытанне не толькі работнікаў МНС, але і старшыняў сельскіх Саветаў, дэпутатаў, старастаў. Як працуем з так званымі цяжкімі сем'ямі, у чыіх дамах, як правіла, і адбываюцца вогненныя трагедыі? Альбо ці прыклалі максімум намаганняў, каб дзеці, чые бацькі на нейкі перыяд былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, вярнуліся ў сям'ю? Трэба не раз у год правесці пасяджэнне адпаведнага каардынацыйнага савета, а працаваць з такімі сем'ямі мэтанакіравана, сістэмна. Не выключана нават, што за асобамі, якія патрабуюць пастаяннага кантролю, варта замацаваць дэпутата, старасту. Каб своечасова атрымліваць інфармацыю пра такіх людзей і прымаць канкрэтныя меры. Працаўладкаваць чалавека ці, можа, зрабіць усё магчымае па абароне ад кампаніі, якая яго цягне ў «бездань».

Мы цяпер фарміруем пастаянныя камісіі абласнога Савета з улікам пажаданняў саміх дэпутатаў. Галоўнае, каб члены камісій маглі плённа працаваць і адчулі, што яны прыносяць рэальную карысць выбаршчыкам. Пры гэтым плануем прадоўжыць ужо закладзеныя традыцыі працы пастаянных камісій з выездам у рэгіёны.

Напрыклад, адно з выязных пасяджэнняў, верагодна, пройдзе ў Дзятлаўскім раёне, каб азнаёміцца і рэкамендаваць іншым вопыт мясцовых уладаў па актывізацыі працы органаў мясцовага тэрытарыяльнага самакіравання і, у прыватнасці, старастаў. Праца старастаў у населеных пунктах, калі яна выконваецца адказна, з душой, вельмі напружаная. І трэба гэтых людзей падтрымліваць, прычым не толькі маральна. У Дзятлаўскім раёне лепшы староста ўзнагароджваецца каштоўным падарункам — халадзільнікам, за другое месца — тэлевізарам, за трэцяе — якім-небудзь бытавым прыборам. Вынікі падводзяцца не толькі за год, але і штоквартальна.

Дарэчы, новая рэдакцыя Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні дае магчымасць заахвочваць працу старастаў і старшыняў пярвічных звёнаў улады, пэўная сума грошай на гэта можа закладвацца ў бюджэт кожным сельскім Саветам.

Канкрэтных дзеянняў патрабуе прэзідэнцкі Указ № 70 па скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў. Тут неабходна мэтанакіраваная праца з ўладальнікамі, большасць якіх наведваецца ў гэтыя хаты ад выпадку да выпадку, а то і не прыязджаюць гадамі. А хто ж будзе наводзіць парадак? На ўзроўні мясцовых выканкамаў, сельскіх Саветаў трэба сістэмна працаваць з гэтымі ўладальнікамі. Патрэбныя ім гэтыя дамы — няхай падтрымліваюць іх у парадку. Не патрэбныя — перадайце ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйнай адзінкі, а сельскі Савет разам з сельгаскааператывам, тутэйшымі жыхарамі вызначацца з іх далейшым лёсам. Калі магчымая рэканструкцыя — яе зробяць і камусьці гэтае жыллё прапануюць. Нельга аднавіць — значыць, неабходны знос, каб у населеным пункце, як кажуць, не было «бяльма на воку».

Не вырашаныя канчаткова і пытанні перадачы дарог у сельскіх населеных пунктах спецыялізаваным арганізацыям. Тое, што мы цяпер робім, — гэта паўмеры. І, зразумела, аднаго жадання мала. Перад старшынямі сельскіх Саветаў стаіць задача афарміць перадачу ў дакументальным плане, але за кожным пашпартам дарогі — пэўная сума. Таму ёсць прыклады, калі ў раёнах на пашпартызацыю дарог закладзена пэўнае фінансаванне ў бюджэце. Праекціроўшчыкі рыхтуюць пашпарты, каб потым перадаць дарогі на баланс адпаведных арганізацый. Калі ж пройдзе перадача, то, адпаведна, будуць прадугледжвацца і сродкі на абслугоўванне дарог. А значыць, будзе менш нараканняў ад мясцовых жыхароў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НА КАНТРОЛІ

ЗАМЕСТ КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГІ — ПЕРАПІСКА...

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон ЛОМАЦЬ зрабіў рабочую паездку ў Бабруйск і Бабруйскі раён, дзе ўзяў удзел у пасяджэнні райвыканкама па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама вывучыў работу шэрагу прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Выступаючы ў Бабруйскім райвыканкаме, Зянон Ломаць, грунтуючыся на вынніках праверак, падкрэсліў, што ў раёне розныя парушэнні і недахопы ёсць у сферы будаўніцтва, у агракомплексе, на спажывецкім рынку, у працы з грамадзянамі. Зянон Ломаць, у прыватнасці, адзначыў, што Бабруйскім выканкамам не прынятыя належныя меры па зніжэнні звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва (33 аб'екты, на будаўніцтва якіх было затрачана 41,2 млрд рублёў). У якасці прыкладу быў прыведзены незавершаны будаўніцтвам (узводзіцца з 1991 года, ступень гатоўнасці аб'екта — 29,3 %) фізкультурна-аздараўленчы комплекс (знаходзіцца на балансе ААТ «ПМК-84 Вадбуд») у пасёлку Туголіца.

У раёне практычна праваленая Праграма развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак, ёсць сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі закупкі малака ў насельніцтва. Так, у жыхара в. Мікулічы Кавалеўскага сельсавета амаль тры тыдні малаказборшчык не прымаў малако ў сувязі з рознагалоссем па яго тлустасці, аднак пасля ўмяшання Камітэта надуманыя перашкоды былі знятыя, прыёмка малака аднавілася.

Старшыня КДК таксама сур'ёзна раскрытыкаваў працу райвыканкама са зваротамі грамадзян, у прыватнасці, па пытаннях развіцця фермерскіх гаспадарак. Напрыклад, замест канкрэтнай дапамогі фермеру службовыя асобы райвыканкама наладзілі перапіску з кіраўніком фермерскай гаспадаркі «Белая Русь» праз органы Дзяржкантролю. Нарэшце паліва на пасяўную было выдзелена, аднак да таго моманту аптымальныя тэрміны сяўбы даўно мінулі, а значыць, фермер асуджаны на недабор ураджаю.

Прэс-служба Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБОРУДОВАНИЯ ОАО «ГОМЕЛЬСКИЙ РАДИОЗАВОД»

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Станок консольно-фрезерный 6Р11 инв. № 5555551373	7 611 600	760 000
2	Станок универсально-фрезерный инв. № 343	3 705 600	370 000
3	Ножницы листовые инв. № 555550454	1 642 800	160 000
4	Вертикально-сверлильный станок 2А 135 инв. № 555551150	1 405 200	140 000
5	Вертикально-сверлильный станок 2Н135 инв. № 920	4 392 000	430 000

Срок подачи заявления	**До 17.00 28 июня 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**29 июня 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условия пользования	Объекты продаются в собственность
Условия продажи	Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %. Вознаграждение – 5 % от цены продажи лота.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» сообщает, что дата проведения аукциона по продаже недвижимости – изолированное помещение (столовая и магазин), расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Объездная, 12 и принадлежащее УП «Торговый дом «Гомельпласт», перенесена на 8 июня 2010 г. в 11.00.

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

«РАШЭННІ ТРЭБА ПРЫМАЦЬ, ЗЫХОДЗЯЧЫ З СІТУАЦЫІ Ў КОЖНЫМ РЭГІЁНЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Клопат пра людзей — гэта, зразумела, важна. Але ж існуе і так званая ўтрыманская псіхалогія: «Дайце!»

— Тут патрэбны вельмі акуратны падыход да кожнай канкрэтнай сітуацыі, каб не парадзіць у вёсцы незадавальненне. Людзі ж ўсё бачаць. І адна справа, калі ў адзінокага, хворага чалавека няма нікога са сваякоў. А зусім іншая, калі дзеці і пальцам не паварухнуць, каб адрамантаваць агароджу на бацькавым падворку.

Дарэчы, новай рэдакцыяй Закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні прадугледжана, што людзі могуць фарміраваць пэўны фонд за свае грошы (сродкі самаабкладання). Возьмем, напрыклад, пытанне навядзення парадку на могілках. Хто пра гэта павінен клапаціцца, калі не жыхары канкрэтнага населенага пункта? Калі ж у іх не атрымліваецца (у саміх моцы няма, дзеці далёка), то ўжо ёсць наступныя прыклады: у населеным пункце праводзіцца сход і людзі пералічваюць, скажам, па адной базавай велічыні на працу па добраўпарадкаванні. Пасля чаго старшыня сельскага Савета можа заплаціць жыллёва-камунальнаму прадпрыемству: прыедуць і навядуць парадак.

Гэта, дарэчы, у пэўным сэнсе і выхаваўчы момант для жыхароў вёскі, іх дзяцей і ўнукаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Галоўны капітал

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Па вялікім рахунку, на сёння лепшага паказчыка, чым індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу, для параўнання краін не выпрацавана, бо ён адлюстроўвае ўзровень як эканамічнага, так і сацыяльнага развіцця краіны.

— Часта нават міжнародныя эксперты заяўляюць, што мы, беларусы, выдумалі сваю ўласную мадэль сацыяльнага развіцця. І гэта правільна, бо кожная краіна выпрацоўвае сваю мадэль, свае падыходы, зыходзячы з сацыяльна-эканамічных, прыродна-кліматычных умоў, з традыцый насельніцтва, — адзначыла Антаніна Морава.

Яна патлумачыла, што ў свеце існуе ўсяго дзве базавыя мадэлі сацыяльнай палітыкі, якія кожная краіна потым «адабляе» сваімі асаблівымі нюансамі: гэта мадэль Бісмарка, якая грунтуецца на сацыяльным страхаванні, і мадэль Беверыджы, значна меней вядомая. У 1942 годзе англійскі вучоны Беверыджы прапанаваў сваю мадэль, сутнасць якой заключалася ў тым, што кожны чалавек павінен атрымаць мінімальную сацыяльную абарону.

— Мы, па вялікім рахунку, узялі за аснову мадэль Беверыджы, — патлумачыла Антаніна Морава, — бо ў аснове нашай сацыяльнай палітыкі закладзены прынцып сацыяльнай абароненасці кожнага. Упершыню гэтая мадэль была акрэслена ў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на бягучую пяцігодку, дзе дастаткова дакладна сфармуляваны ўсе рысы гэтай мадэлі (у тым ліку забеспячэнне даступнасці і бясплатнасці асноўных мінімальных паслуг для ўсіх грамадзян, павышэнне ролі сацыяльных гарантый і мінімальных сацыяльных стандартаў, перараз мяркаванне сацыяльных расходаў дзяржавы на карысць самых малазабяспечаных груп насельніцтва і інш.). Цяпер пакрысе ад мадэлі Беверыджы мы накіроўваемся да мадэлі Бісмарка.

Выступоўца падкрэсліла, што ў новай пяцігодцы асноўным прынцыпам будзе апора на ўласныя сілы. Працаздольнаму насельніцтву будуць давацца магчымасці з дапамогай уласнай працы і прадпрымальнасці забяспечваць свой і сямейны дабрабыт. Гэты момант дакладна абазначаны і ў Пасланні Прэзідэнта.

— Апора на ўласныя сілы становіцца галоўным прынцыпам. Гэта датычыцца і вас, мясцовых улад, бо ў Пасланні акрэслены новыя шляхі працы ў рэгіёнах. Закладзена самастойнасць рэгіёнаў. Яна прапісана і ў новым законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», які ўступае ў дзеянне з 20 ліпеня. Больш будзе паўнамоцтваў, дакладна размяжуецца кампетэнцыя мясцовых органаў кіравання, больш будзе і адказнасці. Гэта рух да дэмакратызацыі і самастойнасці, да таго, каб мясцовыя органы кіравання ператварыліся ў органы самакіравання. Цяпер у свеце акрэсліўся шлях рэгіяналізацыі. З улікам крызісу і падзення вытворчасці многія краіны зразумелі, што дадатковыя рэзервы трэба шукаць на рэгіянальным узроўні. На практыцы гэта ўжо рэалізуецца (даюць самастойнасць мясцовым органам, рэгіёнам).

З улікам крызісу і падзення вытворчасці многія краіны зразумелі, што дадатковыя рэзервы трэба шукаць на рэгіянальным узроўні.

Антаніна Морава патлумачыла прысутным, што ў новых умовах мясцовыя органы кіравання і самакіравання краіны будуць займацца не толькі сферай жыццядзейнасці людзей, але і развіццём рэгіёна ў цэлым. «А гэта азначае, што ў арбіту вашай працы будуць уключацца і вытворчыя пытанні, работа прадпрыемстваў. І гэта правільна.Такое патрабаванне часу».

Інга МІНДАЛЁВА.

ЗАРАБІЦЬ І ПЕНСІЮ, І СТАЖ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Няхітры боршч — таксама поспех

У сваю чаргу некаторыя з выхаванцаў аддзялення дзённага знаходжання толькі тут упершыню ў жыцці змаглі патрапіць у кінатэатр, схадзіць у паход ці з'ездзіць на экскурсію, а таксама знайсці сабе занятак. Безумоўна, гэтыя заняткі рознія, бо ва ўсіх зноў жа далёка не аднолькавыя магчымасці. Нездарма «пад індывідуальныя здольнасці» наладжана работа амаль дзясятка гурткоў. Так, хтосьці мае жаданне (і, што не менш важна, можа) асвоіць фотасправу. Іншыя плятуць з саломкі і бісеру, вучацца шыць, некаторыя па індывідуальных праграмах і ў прысутнасці медработніка наведваюць спартыўную залу. А плюс да таго, у выхаванцаў аддзялення ёсць уласныя цялпіца і кухня.

— Неабходна, каб яны навучыліся даглядаць сябе, умелі прыбраць памяшканне, памыць бялізну, і, вядома ж, прыгатаваць ежу — няхітрыя суп, кашу, бутэрброды, — заўважае Ларыса Шчарбачэвіч. — Так, нехта з іх можа «асвоіць» той жа боршч літаральна з другога разу, а ў некага на гэту навуку пойдзе і год. Але без яе — аніяк. Інакш пра больш-менш самастойнае жыццё не можа быць і гаворкі.

Тым часам, за два гады існавання аддзялення ўжо з'явіўся адзін прэцэдэнт працаўладкавання. І хоць надта прэстыжнай і «грашавітай» работу прыбіральшчыка назваць немагчыма, сам па сабе гэты факт падаецца адметным. Як і іншая акалічнасць — амаль у кожнага з выхаванцаў адзначаецца паляпшэнне стану здароўя.

Амаль па-хатняму

Навучанне людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія застаюцца ў сем'ях, — гэта заўсёды затрата грошай. Тым не менш у параўнанні з пражываннем у дамах-інтэрнатах гэты варыянт атрымліваецца таннейшым і, у любым выпадку, аптымальнейшым у псіхалагічным плане. Таму тут асноўная задача — стварыць умовы для «хатняга догляду». Як заўважае старшыня Валожынскага райсавета Марына Іода, на жаль, праекты многіх будынкаў не прадугледжваюць магчымасці ўстанавіць пандусы ці зручныя для інвалідаў ліфты. Але калі тэхнічная магчымасць ёсць, грошы павінны ўкладвацца. А спецыяльную праграму стварэння безбар'ернага асяродку, дзеянне якой заканчваецца сёлета, трэба абавязкова працягнуць надалей.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

— Асобная гаворка аб тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, — працягвае Марына Іода. — На перспектыву ў аддзяленні дзённага знаходжання ёсць задума наладзіць для маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі невялікія працоўныя майстэрні. Зразумела, напрамак дзейнасці падобных майстэрняў павінен быць вельмі просты — скажам, шыццё нейкага адзення ці вытворчасць сувенірнай прадукцыі. Аднак сама праца ў майстэрнях павінна даваць інваліду хоць і невялікі, але сапраўдны заробак. Адзін момант — тут павінна быць дакладна вырашана пытанне з рэалізацыяй прадукцыі. Гэтую справу трэба ўзаконіць на дзяржаўным узроўні, спрасціць сістэму падаткаабкладання, а калі спатрэбяцца ліцэнзіі — спрасціць і парадак іх выдачы.

Разлічваць на тое, што работа ў майстэрнях зможа вырашыць усе матэрыяльныя праблемы людзей з абмежаванымі магчымасцямі, вядома, не варта. І тым не менш нельга скідваць з рахункаў адзін момант: не выключана, што ў некаторых інвалідаў з'явіцца шанц зарабіць пэўны стаж і перайсці з сацыяльнай на працоўную пенсію. Напрыклад, на сёння ў інваліда II групы памер сацыяльнай пенсіі складае менш за 200 тыс., тады як пенсія працоўная — як мінімум 220 тысяч рублёў. А гэта ўжо розніца.

Сяргей ГРЫБ.

Валожынскі раён.

Дзе «ракі зімуюць»?

На вадасховішчы «Пронькі» ў Мядзельскім раёне работнікі Мядзельскай міжрайінспекцыі разам з прадстаўнікамі Нацыянальнага парку «Нарачанскі» затрымалі чатырох грамадзян.

Яны ў перыяд забароны на лоўлю рыбы і вузкапалага рака здабывалі іх восьцямі. У парушальнікаў канфіскаваная прынада лоўлі, 29 асобінаў рака і адзін лінь. А на вадаёме «Падгорнае» ў Стаўбцоўскім раёне два грамадзяніны лавілі ракаў іншым забароненым спосабам: рукамі з выкарыстаннем ластаў, маскі і гідракасцюма. Паспелі здабыць 104 асобіны, калі былі затрыманыя работнікамі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Здание аптеки с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Брестский р-н, д. Новые Лыщицы, ул. Октябрьская, д. 25
Продавец недвижимого имущества	Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», тел.: 80162 41 69 50, 21 20 45
Сведения о предмете аукциона	Здание 1-этажн., 1953 г.п., площадь – 57,0 кв.м, холодная пристройка, погреб, сарай, уборная, воздушная линия 0,4 кВ, водопроводная сеть. Земельный участок площадью 0,1711 га, для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, для обслуживания жилого дома, срок аренды – 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	17 717 413
Сумма задатка, руб.	1 771 000
Организатор аукциона	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 20 87 85, 23 12 63. www. brest–region.by

Аукцион состоится **30 июня 2010 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 29.06.2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до таты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 29 июня 2010 года включительно.

Усё адно гэта купяць?

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці пры праверцы прадпрыемстваў рознічнага гандлю выявілі ў пераважнай большасці з іх розныя парушэнні. У прыватнасці, у амаль 83 працэнтах праверэных крамаў, ларкоў не прытрымліваліся патрабаванняў да якасці тавараў, якія яны рэалізоўваюць. Напрыклад, у краме і кіёску таварыства «Грант» прадаваліся прадукты (11 найменняў), тэрмін прыдатнасці якіх скончыўся месяц таму. Яшчэ ў дзвюх праверэных крамах цэны на цыгарэты, курыныя яйкі былі завышаны. Замарожаныя тавары захоўваліся пры мінусавай тэмпературы, што не адпавядае патрабаванням.

Па выніках праверак толькі ў першым квартале гэтага года да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 180 парушальнікаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕЗ ЧАСУ НА «РАСКАЧКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Можна і трэба прымаць канкрэтныя захады па стымуляванні вядзення падсобных гаспадарак яшчэ працаздольнымі вяскоўцамі, па пашырэнні іх кола. Для гэтага, напрыклад, выдзяляць ім сена для кароў з першага ўкосу. Увогуле мы мяркуем больш шчыльна працаваць з гаспадаркамі. У прыватнасці, думаем, як дапамагчы людзям з набыццём буйной рагатай жывёлы. Каб у вяскоўца не балела галава, як купіць тую ж карову: пазычаць грошы ў сваякоў, суседа ці браць крэдыт у банку? Лепш дамовіцца такім чынам, каб свайму працаўніку гаспадарка прадавала б кароў па прымальнай цане і ў растэрміноўку — па частках, — упэўнены Ляхоўскі.

На другой сесіі райсавета, якая запланавана на канец гэтага квартала, дэпутаты збіраюцца дэталёва разгледзець ход выканання пастаўленых на прэзідэнцкай нарадзе задач. Ужо ідзе падрыхтоўка да гэтай размовы: вывучаюцца статыстычныя зводкі, прапановы сельскіх Саветаў, старастаў вёсак, робяцца спробы зрабіць прагноз на бліжэйшую і далёкую перспектыву. Адначасова мяркуецца паглядзець папярэднія вынікі рэалізацыі ў раёне Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады. Там, між іншым, ставілася задача актыўна садзейнічаць развіццю сялянскіх (фермерскіх) і асабістых падсобных гаспадарак. Адказ на пытанне, чаму не атрымалася на раённым узроўні ў поўнай меры дасягнуць вызначаных у праграме мэтаў — таксама можа дапамагчы больш аб'ектыўна паглядзець на праблему асабістых падсобных гаспадарак. Бо аўтары праграмы хацелі як лепш, а атрымалася як заўсёды. Як пазбегнуць гэтага «як заўсёды»? Адказ на пытанне і будзе лейтматывам чарговай размовы.

— У склад раённага Савета ўвайшлі людзі адукаваныя, кампетэнтныя ў сваёй сферы дзейнасці, мэтанакіраваныя. Таму дыскусія абяцае атрымацца цікавай і змястоўнай, — гаворыць Аляксандр Аляксандравіч.

Леанід ТУГАРЫН.

Смалявіцкі раён.

ПОПЫТ НА ГАСПАДАРА З КАНЁМ І ТРАКТАРАМ

Вясна сёлета задалася дажджлівая. Але вяскоўцы, нягледзячы на дождж, намагаліся ў майскія дні парабіць грады і пасадзіць бульбу на прысядзібных участках.

У вёсцы Цеалін Дубровенскага раёна каля трох дзясяткаў дамоў. Пастаянныя жыхары жывуць толькі ў дзесяці з іх. А ў астатнія наязджаюць вясной, як дачнікі. Хто больш бульбы пасадзіць, хто менш, але прысядзібныя ўчасткі засяваюцца. А самы дагледжаны падворак у старэйшыны вёскі Івана Лапусева. У яго ёсць для сельскагаспадарчых работ трактарок і конь. Іван Захаравіч адрэгуляваў свой трактар так, што ён працуе з такім жа плугам, у які ўпрагаюць каня. Так што зручна бульбу садзіць і за трактарам.

Старэйшына расказаў, як спраўляецца ўся вёска, і ён у тым ліку, з веснавымі работамі на падворках.

— Цяпер ужо не просяць у калгасе каня, як гэта было раней. Коней у СВК мала. У Цеаліне, напрыклад, ёсць толькі адзін конь на абслугоўванні мясцовай фермы, і той заняты на працягу працоўнага дня. Ды вяскоўцы і не прэтэндуюць. Каб узараць агарод пад бульбу і іншыя культуры, шукаюць у акрузе гаспадара, у якога ёсць свой конь. А такіх гаспадароў хапае ў Дуброўне і бліжэйшых вёсках. Вось з імі і дамаўляюцца, каб апрацаваць свае надзелы. Праблем сёлета няма: усе, як звычайна, укладуцца ў тэрміны пасяўной, якія дыктуе прырода. І ўвосень гэтак жа збяруць з агародаў ураджай. Праўда, збожжа ўвосень дапамагае абмалаціць мясцовы кааператыў, дае камбайн.

Іван Захаравіч заўважыў, што сёння вясковец ужо не спадзяецца на калгасны трактар ці каня (адвык), а плануе справы, спадзеючыся на свае магчымасці і сілы. Селянін па-ранейшаму корміцца пераважна з таго, што вырасціць на сваім участку. Агародніна, садавіна — усё сваё. Калі трымае карову, то і малочнымі прадуктамі забяспечаны. Мяса птушкі, свініну таксама для сябе можа «арганізаваць».

На погляд старэйшыны, цяпер сяльчане звяртаюць больш увагі на гатункі насення той жа бульбы і іншай агародніны, дабіваючыся такім чынам, каб ураджайнасць была вышэй.

На сваім участку Іван Захаравіч культывіруе аж дзесяць гатункаў бульбы, а купляе насенны матэрыял у Самахвалавічах пад Мінскам. Вясной пасадзіў кожнага гатунку па некалькі «шнуроў». Сярод іх ранняя «Сіняўочка», якую любяць у сям'і за добрыя смакавыя якасці, а таксама «Уладар», «Журавінка», «Скарб». Кожнаму гатунку гаспадар даў характарыстыку. Напрыклад, смакавыя якасці «Скарбу», на яго погляд, залежаць ад глебы (што пераважае: пясок ці гліна).

Старэйшына Іван ЛАПУСЕЎ.

Цікава, што і садзяць бульбу ў сям'і Лапусевых рознымі спосабамі. Сёлета эксперыментавалі з пасадкай на невялікім кавалку зямлі. На ўзараным участку паклалі радком бульбу на паверхні глебы, прысыпалі льнокастрой, а затым — саломай. Бульба павінна прарасці скрозь салому, а вось пустазелле па задумцы расці не павінна. Пры такім спосабе кустоўе бульбы не трэба акучваць і палоць. А ўвосень рэкамендуецца проста згрэбці салому і... сабраць з паверхні клубні новага ўраджаю.

Іван Захаравіч з жонкай Надзеяй Мікалаеўнай вырашылі праверыць на практыцы, ці магчыма такім лёгкім спосабам вырасціць бульбу. Калі эксперымент удасца, тады Лапусевы раскажуць пра свае вопыты аднавяскоўцам.

Старэйшына разважаў і пра тое, пры якіх умовах сельскі жыхар будзе трымацца за кавалак зямлі. Каб не было ў вёсцы прысядзібных участкаў, што зараслі пустазеллем, трэба наладзіць вытворчасць зручных і недарагіх механізмаў для апрацоўкі агародаў, прычым усе прылады павінны быць у продажы.

Паколькі сам Іван Захаравіч мае трактарок з прычэпам, то дзякуючы гэтаму, можа ўтрымліваць карову. Пры дапамозе прычапнога інвентару ён і траву скосіць, і паварушыць яе, і ў пуню сена прывязе. Калі б не меў трактара, то карову даўно ўжо збыў бы, сцвярджае гаспадар.

Як старэйшына, Іван Лапусеў дапамагае з перавозкамі і жыхарам сваёй вёскі. Прывязе салому ці будматэрыялы адзінокім старым, альбо штыкетнік для агароджы ўсёй вёсцы. Аднавяскоўцы ўжо вострацъ косы, бо неўзабаве старэйшына загадае абкасіць свае падворкі, каб кожная сядзіба была добраўпарадкаванай. Ды як не абкасіць, калі Лапусевы самі паказваюць прыклад? На іх падворку чысціня і парадак, перад хатай шмат кветак. Самавіта глядзіцца самы важны аб'ект — калодзеж, бо чыстая пітная вада, як вядома, першачарговая патрэба чалавека.

Вольга ШУТАВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.50	21.24	16.34
Віцебск —	4.33	21.21	16.48
Магілёў —	4.40	21.14	16.34
Гомель —	4.45	21.02	16.17
Гродна —	5.07	21.38	16.31
Брэст —	5.15	21.30	16.15

Месяц

Поўня 28 мая.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Максіма, Мікіты, Нікіфара, Сідара.*

К. *Магдалены, Аўгусціна, Юльяна, Яна.*

ЩОМЫСЛИЦКИЙ СЕЛЬИСПОЛКОМ МИНСКОГО РАЙОНА

объявляет запрос ценовых предложений на аренду мусорного контейнера и фронтального погрузчика для сбора и вывоза мусора.

Предложения принимаются **до 20.06.2010** по адресу: 2**23049, Минский р-н, аг. Щомыслица, ул. Жуковского, 44, сельисполком, тел. 5093034**.

УНП 600052373

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.